# ЭКАЛОГІЯ КУЛЬТУРЫ

**І. І. Заяц, Ю. Ю. Караленка**

*Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога, Беларусь*

Навуковы кіраўнік М. У. Буракова, канд. філал. навук, дац.

Нацыянальная культура павінна быць «асновай, зместам новай выхаўчай сістэмы» сучаснай беларускай моладзі. Не выпадкова ў «Законе аб адукацыі» падкрэсліваецца, што «адукацыя і выхаванне ў Беларусі павінна ажыццяўляцца на аснове нацыянальных традыцый» [1]. На вялікі жаль, даследаванне нацыянальнай самасвядомасці беларускай моладзі паказвае, што беларуская мова і культура не з'яўляюцца нормай культурнага быцця. Нізкі ўзровень самасвядомасці і культуры ў прадстаўнікоў маладога пакалення не можа не выклікаць трывогу ў грамадства. Бо калі моладзь не можа інтэгравацца ва ўласную культуру, не можа адаптавацца да чужаземнай культуры, то ствараецца сітуацыя раскультурвання, а гэта пагражае агульнай бескультурнасцю грамадства.

Асаблівую актуальнасць у такой сітуацыі набывае паняцце «экалогія культуры», уведзенае яшчэ Д. С. Ліхачовым, якое абазначае і захаванне культурнага асяроддзя, і актыўную дзейсную памяць пра мінулае, і асэнсаванне страшэннай небяспекі забыцця. Гэта вельмі важна сёння для маральнага асяроддзя, выпрацоўкі каштоўнасных арыенціраў, духоўнасці сучаснай моладзі. На наш погляд, зварот да культурнай спадчыны беларусаў, асабліва да народных святаў, звычаяў і іх сімвалаў дапаможа ў фарміраванні пачуцця нацыянальнай самасвядомасці. Адным з прыкладаў такога звароту з'яўляецца абрад «Каляды», які не можа не прыцягнуць увагу і не выклікаць цікавасць моладзі, асабліва ў ролі дзеючых асоб, а не проста назіральнькаў за тэатралізаванымі дзеяннямі, якія сталі ўсё часцей праводзіцца як масавыя мерапрыемствы горада.

Недахопам такіх мерапрыемстваў становіцца павярхоўнае знаёмства са святам і яго персанажамі, дзе амаль адсутнічае пазнаваўчая этнакультуралагічная інфармацыя (гістарычная даведка) пра свята і святочныя сімвалы, у сувязі з чым адзначым пэўную інфармацыю.

*Гісторыя свята.* Беларуская народная традыцыя святкавання Каляд вытокамі ўзыходзіць да старажытнаславянскіх і нават індаеўрапейскіх язычніцкіх вераванняў. Каляды (7 студзеня) былі пачаткам язычніцкага святкавання ў гонар зімовага сонцавароту і каляднага мясаеду пасля шасцітыднёвага Піліпаўскага посту. На язычніцкае святкаванне каляднага сонцавароту наслаіўся хрысціянскі рытуал нараджэння Хрыстова – свята Раства, якое ў дадатак адзначаецца на Беларусі па каталіцкаму грыгарыянскаму новаму стылю 25 снежня і па праваслаўнаму юліянскаму 7 студзеня (розніца паміж імі 13 дзён). Адпаведна па старому стылю з 13 на 14 студзеня захоўваецца і сустрэча Новага года, вядомая як Шчодрык (Шчодры вечар). Заканчваліся зімовыя святы Вадохрышчам, якое да хрысціянства, відаць, было заканчэннем Каляд. Праваслаўе як больш дэмакратычная і цярпімая да язычніцкай культуры канфесія прычынілася да таго, што зімовыя святкі беларусаў захаваліся пераважна па юліянскаму календару.

*Асноўныя сімвалы і рытуалы свята.* Асноўны рытуал – Куцця, рытуальная ежа – каша з пшаніцы або ячменю, якую варылі раней за іншыя стравы і ставілі ў хаце на ганаровым месцы – «на куце». Адсюль і яе назва – «куцця». І ўся святочная вячэра называлася Куццёй. Гаршчок са свежай, яшчэ гарачай пшанічнай або ячнай кашай з'яўляецца своеасаблівым «правобразам» ёлкі і сімвалам старажытнага

рытуальнага ачага, у якім магічная роля адводзілася і самому агню, і зярнятам пшаніцы, ячменю, жыта, бабовых (прычым не толькі іх гліняным мадэлям, але і рэальным), а таксама крыжыкам з цеста і рагатым праснакам, якія смажыліся і выпякаліся, як можна меркаваць, на гэтым свяшчэнным агні. Урачыста вячэралі на Каляды тройчы: у першы дзень свята (25 снежня «посная куцця» – кашу варылі з мёдам або з маслам). Затым, 13 студзеня, елі багатую, шчодрую куццю, «шчадрэц» (кашу гатавалі з мясам і салам). І, нарэшце, перад Вадохрышчам, 18 студзеня (зноў «посная», «галодная», «вадзяная» куцця). За рытуальным сталом сямейнікі (а ўрачыстая вячэра мела на ўвазе збор усёй сям'і) займаліся варажбой. Напрыклад, перш чым паставіць куццю на стол, клалі на яго сена (салому), наверх засцілалі абрус. Павячэраўшы, пачыналі стукаць па сене кулакамі, а затым выцягвалі па адной саломінцы і па яе даўжыні вызначалі, які будзе лён у новым годзе, а па колькасці выбітых зярняткаў меркавалі пра будучы ўраджай жыта. Агульная колькасць страў дасягала 7, 9, 12, бо лічылася, што багатая вячэра – гэта залог пастаяннага дастатку ў доме на ўвесь надыходзячы год.

Навагоднія ігрышчы ў сваіх найстаражытнейшых вытоках уяўлялі сабой працяглы, 12-дзённы, заклінальны комплекс, у час якога падводзілі вынік мінулага года, рабілі заклены на ўсе 12 месяцаў года наступнага. У многіх першапачатковых навагодніх ігрышчах узнаўляліся ў мініяцюры розныя абрады наступных месяцаў. Свечкі і рознакаляровыя лямпачкі на ёлках – прыблізны «водбліск» старажытнага свяшчэннага агню. У канцы снежня ў час зімовага сонцастаяння славяне запальвалі свяшчэнны «жывы» агонь, які гарэў 12 дзён (шэсць дзён – у канцы старога года і шэсць – у пачатку новага). Ёлка з запаленымі свечкамі ці лямпачкамі – сімвал палаючага дрэва ў старажытным святым хатнім ачагу. Але чаму менавіта яліна? Старажытныя славяне ўстанаўлівалі ў ачагу смалістыя чурбаны хвойных дрэў, елкі ці сасны, якія маглі тлець на працягу ўсяго рытуальнага тэрміна.

«Калядаванне» – адна з самых яркіх традыцый, што дайшла да сучаснасці. Лічылася, што толькі вяселле і шумлівыя гулянні могуць напалохаць злыдняў, павылазіўшых з таго свету, ды аберагчы людзей ад іх. Моладзь збіралася разам, пераапраналася ў строі істотных татэмных жывёл (мядзведзя – увасабленне Велеса, карову, казу, каня – сімвалы дастатку, багацця, бусла – што лічыўся талісманам удачы, ладу) і хадзілі па хатах, спяваючы калядныя песні з пажаданнямі ўсяго лепшага, услаўляючы сілы святла і граючы на музычных інструментах. Чым часцей узгадваліся розныя магічныя формулы, тым больш дзейснымі яны лічыліся. Гаспадары ж, каторых наведалі калядоўшчыкі, якія давалі ў падзяку за абарону ад нячысцікаў розныя прысмакі. Часцей за ўсё гэта былі арэхі, семечкі, пернікі і печыва, сухафрукты, пазней – цукеркі. Гэтая ежа лічылася ахвярай спрыяльным да чалавека баствам, каб заручыцца іх дапамогай. Адмовіць калядоўшчыкам у пачастунках было тое самае, што наклікаць на сябе няміласць усіх татэмных жывёл, пазбавіць сябе дабрабыту на ўвесь наступны год. З поўнымі мяшкамі пачастункаў калядоўшчыкі збіраліся ў адным месцы, у вялікай хаце ці на вуліцы, дзе разам «прыгаворвалі» дары, палілі вогнішчы, спявалі ды танчылі ўскруг іх, каб сваёй бадзёрасцю і ўзнятым настроем дапамагчы светлым сілам атрымаць перамогу над цемнымі. Ну і каб сагрэцца, канечне, бо надвор’е стаяла халоднае.

Вывучэнне гісторыі беларускіх свят і традыцый, выкарыстанне этнакультуралагічнай інфармацыі пра ўзнікненне свята, яго сімвалы будзе садзейнічаць усведамленню сябе як прадстаўнікоў беларускага народа, павышэнню ведаў па гісторыі Беларусі, беларускай мовы і інш., а замежным студэнтам, якія вучацца ў ВНУ Беларусі, знаемству з культурай беларусаў.

Л і т а р а т у р а

1. Латыш, М. І. Сення. Заўтра. Вечна. Адраджэнне нацыянальных традыцый у выхаванні моладзі / М. І. Латыш // Адукацыя і выхаванне. – 1992. – № 6. – С. 23–28.
2. Ліцьвінка, В. Д. Святы і абрады беларусаў / В. Д. Ліцьвінка. – Мінск : Беларусь, 2001. – 190 с.
3. Кухаронак, Т. І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Ураджай, 2001. – 239 с.